# БРАЦКАЯ МАГІЛА
# (СМАЛЯВІЦКІ РАЁН, В. МАСЦІШЧА)



**Шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці** (паводле [дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь]): 613Д000581

**Месцазнаходжанне:** Смалявіцкі раён, в. Масцішча, на ўсходняй частке, каля вёскі

**Каардынаты:** 53.941831, 27.996294

**Кароткае апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў в. Масцішча Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі, знаходзіцца на ўскраіне вёскі, да помніка вядзе ліпавая алея. У 1951 г. на магіле пастаўлены помнік. Пахавана 29 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1941-1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў в. Масцішча Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі (**613Д000581**), які ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Помнік знаходзіцца на ўскраіне вёскі, да помніка вядзе ліпавая алея. У 1951 г. на магіле пастаўлены помнік-скульптура воіна з аўтаматам. На пастаменце ўмацавана пліта з мармуру, на якой напісана каму прысвечаны помнік.

У 2021 годзе на брацкай магіле быў праведзены рамонт: была выканана работа па добраўпарадкаванні прылеглай да воінскага пахавання тэрыторыі, заменена пліта з імёнамі загінуўшых воінаў і партызан, а таксама пастамент скульптуры быў абліцаваны гранітнай пліткай.

У брацкай магіле пахаваны 29 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1941-1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных – воіны, што загінулі ў ліпені 1944 г. пры разгроме акружанай пад Мінскам групоўкі нямецка-фашысцкіх войск.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gosspisok.gov.by/?AspxAutoDetectCookieSupport=1. – Дата доступа: 20.12.2022.

2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Кніга 2 / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў [і інш]. – Мн. : БелСЭ, 1987. – 308 с.

3. Памяць. Беларусь : рэспубліканская кніга / С. П. Самуэль [і інш.]; пад агул. рэд. Б. І. Сачанка. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1995. – 623 с.

4. Памяць : Смалявіцкі раён. Жодзіна : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / [уклад.: Ю. Я. Гіндзін, Г. У. Разумаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 768 с.